З каталіцкіх СМІ (170)

Аўтар: Рэдакцыя
09.09.2018 00:00

Фігура Маці Божай
з Фацімы адправіцца
ў Панаму

Яна будзе дастаўлена ў лацінаамерыканскую краіну з нагоды Сусветных дзён моладзі, якія пройдуць у 2019 годзе. Скульптурная выява Найсвяцейшай Панны Марыі апошні раз пакідала Партугалію ў 2000 годзе. Дагэтуль яе перэгрынацыя праходзіла ў 64-ох краінах свету.

Даставіць арыгінальную фігуру ў Панаму было вырашана ў сувязі з тым, што вялікую пашану да Маці Божай Фацімскай меў св. Ян Павел II – ініцыятар Сусветных дзён моладзі, а таксама з прычыны шырокай распаўсюджанасці Яе культу сярод вернікаў Панамы. †

Ва Украіне з'явіўся
Мемарыял пакутнікаў
за веру

Помнік створаны ў знак павагі да тых хрысціян, якія засталіся вернымі і не адракліся ад сваёй веры. Мемарыял будзе не толькі месцам памяці, але і навучальнай установай, у якой моладзь і іншыя наведвальнікі змогуць атрымліваць інфармацыю аб нядаўнім праследаванні Касцёла ва Украіне і аб тых вернікаў, якім цяперашняе пакаленне абавязана свабодай веравызнання.

"Гэта сучасная форма прэзентацыі жыцця і дзейнасці каталікаў у часы камуністычных ганенняў. У калекцыях мемарыяла сабрана шмат помнікаў, якія звязаны з іх жыццём, працай, зняволеннем і мучаніцкай смерцю", – гаворыцца ў паведамленні адміністрацыі мемарыяла.

Сусветны цэнтр міру
адкрыты ў
Непакалянаве

Гэта адзінае месца ў Польшчы і адно з 12-ці ў свеце, якое належыць да 12-ці зорак у Кароне Марыі Каралевы Супакою – 12-ці асяродкаў малітвы за мір, у якіх будуць знаходзіцца капліцы вечнай адарацыі Найсвяцейшага Сакраманту, т. зв.

Аўтар: Рэдакцыя
09.09.2018 00:00

Капліцы супакою. Цэнтральнай часткай алтара ў капліцы ў Сусветным цэнтры малітвы аб супакоі ў Непакалянаве з’яўляецца постаць Беззаганнай Марыі ў натуральную велічыню з раскрытымі ў жэсце запрашэння далонямі. Эўхарыстычны Хрыстос знаходзіцца пад сэрцам Марыі, у вялікай 20-сантыметровай асвечанай Гостыі, бачнай з-пад расхінутых шатаў. Вакол сярэбранай постаці Маці Божай сплецены вянок з лілій натуральнай велічыні, што сімвалізуе чыстасць і Беззаганнае Зачацце Марыі.